# Спеўны веснавы настрой

**У межах «Бібліяночы-2022» у зале беларускай літаратуры Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі пад дэвізам «Энергія традыцый» выступіў этна-фольк-гурт «*Guda*», адметнасць якога — жаночае акапэльнае выкананне абрадавых спеваў, захаванне аўтэнтычнага гучання. Гурт прадставіла Вікторыя Міхно.**

— Наш калектыў дзейнічае з 1996-га, мы пачыналі выступаць у студэнцкія гады. Гэта быў асяродак эксперыментальнага пошуку ў галіне архаічнай спеўнай спадчыны. Этнаграфічныя экспедыцыі, падчас якіх адбываліся непасрэдныя кантакты з жывымі носьбітамі традыцыі, работа з аўдыя- і відэаматэрыяламі, кансультацыі з фалькларыстамі і этнамузыколагамі дазволілі нам пераняць асаблівасці старадаўняй спеўнай традыцыі.

Творчай мэтай гурта з'яўляецца не толькі захаванне і трансляцыя старадаўняга спеўнага мастацтва, але і сцвярджэнне адметнага светапогляду, у аснове якога — разуменне сакральнасці традыцыйнай культуры. Шмат гадоў удзельнікі працуюць над зборам матэрыялу і стараюцца спасцігнуць глыбіню зместу песень.

Склад удзельніц гурта «*Guda*» неаднаразова змяняўся, сярод прадстаўніц старэйшага пакалення былі Любоў Сівурава і Вольга Емяльянчык, выкладчыцы БДУКіМ і Полацкага ўніверсітэта, у гурце выступалі Ганна Емялёва і Дар'я Зуева, Таццяна Бароўка, Кацярына Акімава, Вольга Тарасевіч і іншыя дзяўчаты. Аднак нязменнай заставалася спецыфічнае гучанне, надзвычай набліжанае да аўтэнтычнага. Калектыў браў удзел у шматлікіх музычных фестывалях у Беларусі і Польшчы, выпусціў некалькі сольных студыйных альбомаў, а таксама ўдзельнічаў у супольных праектах, у тым ліку ў галіне электроннай музыкі.

— Усе, хто прыйшоў на вясновую вечарыну, удзячны за гасціннасць Нацыянальнай бібліятэцы. Тут сапраўдны скарб кніжнасці, духоўнасці і культуры, — адзначыла кіраўніца гурта.



Пастаянныя чытачы і госці бібліятэкі з задавальненнем слухалі спевы і разам з удзельнікамі гурта з азартам танцавалі лявоніху.

**Эла ДЗВІНСКАЯ, фота аўтара**